Т. Ф. Сухоцкая *(г. Мінск)*

# РАМАН І. К. КАНДРАЦЬЕВА «БИЧ БОЖИЙ» («ГУННЫ»): КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Шлях І. Кандрацьева, літаратара XIX ст., ляжаў праз асэнсаванне расійскай рэчаіснасці. Ён зыходзіў з таго, што няведанне мінулага з’яўляецца прычынай трагічных калізій сучаснасці. Паступова зварот да нацыянальнай гісторыі ў культуры XIX ст. суправаджаецца пераходам ад канцэпцыі індывідуальнага суб’екта да канцэпцыі суб’екта супольнага. У цэнтры ўвагі І. Кандрацьева («Драма на Лубянке», «Бич Божий» («Гунны»)) пастаўлена праблема гістарычнай абумоўленасці становішча асобы, яе ўключанасці ў грамадска-сацыяльныя працэсы. Паказальнымі ў гэтых адносінах з’яўляюцца яго ацэнкі знакавых фігур гістарычных эпох: Ацілы, Эрманарыха, Валенцініяна, Напалеона, Кутузава і інш. Проза І. Кандрацьева мэтанакіравана звяртаецца да паглыбленага асэнсавання сутнасці гістарычнага працэсу і месца і ролі чалавека ў ім.

Раман «Бич Божий» («Гунны») – гэта не гістарычнае даследаванне, а мастацкі твор, у аснове якога ляжыць нетрадыцыйны погляд на гісторыю гунаў як аднаго са славянскіх плямёнаў венедаў і іх важака Ацілы. Рускі мысліцель М. Данілеўскі лічыў гунаў, манголаў, туркаў, якія разбурылі старажытныя цывілізацыі, «адмоўнымі дзеячамі» чалавецтва. Сугучна выказваўся ў XX ст. вядомы беларускі пісьменнік К. Чорны. У публіцыстычным артыкуле «Немцы знішчаюць беларускую культуру…» (1942) ён у самым пачатку зазначыў: «Увесь свет даўно і добра ведае, што фашысты – гэта гуны, самыя пачварныя дзікуны, якіх не ведала самая старажытная першабытная гісторыя. Аб гэтых якасцях фашысты з усёй паўнатой заявілі перш за ўсё ў сябе, у Германіі. Адразу ж пасля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыходу Гітлера і яго зграі да ўлады ў Германіі пачаўся паход зверападобных істот супраць усяго жывога, чалавечага, светлага. Фашысты пачалі крывавыя расправы над усімі тымі, хто не схіліў свае галавы перад рэжымам тэрору, здзекаў і катаванняў» [3, с.457].

І. Кандрацьеў па-майстэрску рэканструюе мінулае на аснове тагачасных гістарычных канцэпцый і мастацкага светабачання. У тэкст рамана ўключана плынь навуковых падыходаў да гістарычных падзей славянскай даўніны з пазіцый заходніх сярэдневяковых даследчыкаў, якія зыходзілі з адзінства народа славянскага і гунаў (Саксон Граматык, Адам Брэменскі, Гельмальд з Басау). Дадзены погляд актуалізаваўся ў XIX ст. у асяроддзі расійскіх гісторыкаў П. Шафарыка, І. Забеліна, Д. Ілавайскага. Аднак большасць даследчыкаў у вобласці гуманітарыстыкі гіпотэзу ідэнтыфікацыі гунаў са славянамі адмаўляюць. Прынята гунаў лічыць качавым народам, які прыйшоў з Манголіі і жыў пераважна з разбою. Для такой супольнасці не ўласціва высокая ступень культуратворчасці, чаго не скажаш пра славян. Для апошніх галоўным спосабам вытворчай дзейнасці стала земляробства. Плён працы на зямлі быў гарантыяй свабоды і надзейнай будучыні. Прагматычныя адносіны да свету пераключаліся ў сферу стасункаў з зямлёй, вадой, сонцам, зорамі, вятрамі, свойскай жывёлай. Так складвалася вельмі паэтычная ў гісторыі чалавецтва эстэтыка земляробчага календара, прасякнутая патрэбай бачыць прыгажосць свету і тварыць яе ў згодзе з прыродным космасам. Сімволіка і семантыка культуры земляробчага календара вызначылі характар і напрамак развіцця сістэмы каштоўнасных арыентацый.

Сродкам арганізацыі сэнсавых пластоў у рамане І. Кандрацьева «Бич Божий», сродкам арганізацыі свету герояў і іх самавызначэння ў ім з’яўляецца хранатоп.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дадзенае паняцце падразумявае мастацкае адзінства прасторы і часу. Хранатоп з’яўляецца ўласцівасцю як часавых, так і прасторавых відаў мастацкай культуры, але яго сэнсатворныя і аксіялагічныя функцыі найбольш выразна ажыццяўляюцца ў мастацкай літаратуры. Як сцвярджае М. Бахцін, «…вступление в сферу смыслов совершается только через ворота хронотопов»: сэнсы тэксту могуць быць выяўлены толькі праз іх прасторава-часавае выражэнне [1, с.406]. Літаратуразнаўства, зразумела, не абыходзіла ўвагай змест хранатопу ў літаратуры. Культурфіласофскае ж яго напаўненне і ўнутраная дынаміка раскрываюцца пры ўмове цэласнага падыходу, з пазіцый культуралагічнага аналізу.

М. Бахцін увёў і паняцце «вялікі час» гісторыі сусветнай культуры. Пры дапамозе яго ўзнаўляюцца гістарычныя падзеі і адраджаецца іх культурны сэнс, пад якім трэба разумець вербальна адлюстраванае сутнаснае значэнне культурнага феномена, якое мае сацыяльна значымую інтэнцыю. Раскрыццё культурна-гістарычных сэнсаў прасторы і часу садзейнічае разуменню «чалавечай сітуацыі» (Э. Фром).

Хранатоп у культуры адлюстроўвае ступень інтэнсіфікацыі культурнай жыццядзейнасці ў прасторы і часе. Ён скіраваны на фарміраванне стылю культуры. Каштоўнасная акрэсленасць хранатопа выяўляецца найперш праз топасы, апазнавальныя знакі культурнай прасторы, – структурна функцыянальнае падабенства тэкстаў ці кампанентаў. У рамане І. Кандрацьева – гэта сцэны пакарання смерцю, дарога, сустрэча, ахвярапрынашэнне, бітва, пір і інш. Семантыка разбуранай прасторы, крывавага часу забяспечваецца частым зваротам да падрабязнага апісання катаванняў. Адным са стылеўтваральных фактараў у рамане з’яўляецца прырода, якая, у якасці пейзажа, выступае асноўным «месцам дзеяння» і яго фонам. Трагедыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

несумяшчальнасці свету прыроды і чалавечага свету раскрыта ў сцэнах укрыжавання, ахвярапрынашэння: «…ликовала расцветающая природа… Плотники воздвигали целый ряд грубых, бревенчатых крестов» для ўкрыжавання венедскіх князёў [2, с.3]. Прынцып супрацьпастаўлення працуе на паглыбленне культурнага сэнсу, крышталізацыю каштоўнаснага зместу. Сюжэтныя падзеі ў хранатопе рамана канкрэтызуюцца, даецца дакладнае ўказанне месца і часу іх здзяйснення.

Хранатоп у рамане дынамічны, нестабільны, культурная прастора і чалавек у ёй знаходзяцца ў руху. Пераважае патэнцыя змен, якія пакідаюць глыбокія сляды ў самім чалавеку і яго жыцці. …Лютасць Аціла прарастае паступова. Зерне варожасці атруціла яго душу ў дзяцінстве. Катаванні і здзекі готаў над венедамі спрыялі выхаванню тырана. Ідэя свабоды, змагання за свой народ і зямлю перарадзілася ў лютасць і разбой. «Болемир измерил храбреца взглядом и хотел улыбнуться, но улыбка почему-то застыла на его губах. В этом детском «никто» Болемиру почудилось нечто знаменательное, даже угрожающее; что-то как бы роковое и как бы грозное прозвучало в этом коротком слове, произнесенном стоящим перед ним невзрачным, некрасивым существом. Сколько в нем было твердости, сколько самоуверенности!» [2, с.28.]. Нечалавечая ахвяра героя рамана дзеля свайго народа (адмовіўся ад прапановы готаў, і тады тыя катавалі жонку і сына-неўмаляці на яго вачах) робіць яго зверам.

У рэчышчы фізіягнамічнага метаду, прапанаванага О. Шпенглерам для вывучэння культур, можна ґаварыць пра вызначальную ролю вялікіх асоб ў гісторыка-культурным працэсе, якім уласціва такая формаўтваральная або знішчальная сіла, у якой растае лёс чалавека і этнасу. Вобраз Аціла стаў сімвалам эпохі «перасялення народаў». Семантыка разбою і крывавых перамог гунаў у рамане

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І. Кандрацьева асацыіруецца, найперш, з гэтым іх правадыром. Лёсавызначальную місію дадзенага вобраза ў сусветнай гісторыі І. Кандрацьеў выяўляе праз канцэпт «біч Божы» – кара нябёсаў.

Адлюстраванне аўтарскай канцэпцыі ў рамане абумоўлена адметнасцю індывідуальнага стылю І. Кандрацьева, жывапіснага, каларытнага, аб'ёмнага. Пісьменнік па-майстэрску карыстаецца формай лубка, што падкрэслівае і ўзбагачае індывідуальнасць стылю. Пры гэтым імкненне пісьменніка да праўдападабенства часта разумеецца як аснова сапраўднага гістарызму. Творам на гістарычную тэму вельмі складана вызваліцца ад перанасычэння гістарычнымі фактамі, рэаліямі, ад скрупулёзных і ў мастацкіх адносінах неэфектыўных спасылак на гістарычныя дакументы, матэрыялы – усё гэта ў пэўнай ступені ўласціва і раману «Бич Божий» («Гунны»). Працэсы браджэння і крышталізацыі індывідуальнага стылю І. Кандрацьева абумоўлены разуменнем істотнай ролі гістарычных фактаў, ступені і глыбіні іх асэнсавання і адлюстравання ў творы, навуковымі ведамі пра гістарычныя падзеі мінулых эпох.

Фальклорная традыцыя ўзбагачае стылёвую палітру пісьменніка. У прыведзеным рамане І. Кандрацьева славянская даўніна аднаўляецца праз зварот да багоў Перуна, Лады, Даждзьбога, праз апісанне розных абрадаў. Народнай культуры ўласцівы чысціня, хараство, агульначалавечыя нормы дабрыні. Менавіта на такую сістэму каштоўнасцей арыентаваў венедаў, сваю ўнучку Юрыцу і ўнука Ацілу князь Будлі. Фальклорныя матывы гучаць у варажбе з зязюлей Юрыцы, у песні гусляроў, якія спяваюць на піры ў гонар Ацілы, у апавяданні пра сваю радзіму блазна Хара Мурына.

Асаблівую цікавасць у гістарычным рамане выклікаюць сімвалічныя ролі касцюма, падрабязнае апісанне зброі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культавых рэчаў, прадметаў побыту, збудаванняў, якія выступаюць, найперш, як сродак стварэння каларыту гістарычнай эпохі і часта спосабам характарыстыкі персанажаў. Семантыка касцюма дапаўняе і ўдакладняе змест культурнай эпохі, норавы, быт, пашырае і паглыбляе ўяўленне пра творчую індывідуальнасць аўтараў гістарычных раманаў.

Культуралагічнае асэнсаванне творчай спадчыны І. Кандрацьева толькі пачынаецца. Даследаванне яго твораў у рэчышчы культуралагічных канцэпцый стане істотным дадаткам да культуралагічнага дыскурсу. Адметнасць стылю пісьменніка сведчыць пра акрэсленасць светапоглядных пазіцый, імкненне сцвердзіць каштоўнасць гуманістычнага ідэалу ў гісторыка-культурным працэсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Бахтин, М.М.* Вопросы литературы и эстетики : исслед. разных лет. – М. : Худож. лит., 1975.

2. *Кондратьев, И.К.* Бич Божий : ист. роман. Божье знаменье : повесть. – М. : Панорама, 1994.

3. *Чорны, К.* Немцы знішчаюць беларускую культуру, топчуць асвету і навуку, мастацтва і літаратуру / К. Чорны // Зб. тв. : у 8 т. – Мінск : Мастац. літ., 1975. – Т. 8. – С. 457–460.